

ЦІ ЛЁГКА ПРАЦАВАЦЬ АНІМАТАРАМ У САНАТОРЫІ?

ЧЫРВОНКА

СТАЦЬ СПЕЦЫЯЛІСТАМ... АНЛАЙН

ЧЫРВОНКА



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

5 ВЕРАСНЯ 2019 г. ЧАЦВЕР № 168 (29035)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Мы абавязкова павінны атрымліваць зваротную сувязь ад нашых грамадзян, каб вырашаць тыя актуальныя пытанні, якія іх хвалююць. Акрамя таго, улада павінна бачыць, які эфект прыносяць рашэнні, што яна прымае. Напрыклад, падчас такіх прыёмаў грамадзяне падказваюць, дзе ёсць нейкія прабелы і шурпатасці ў заканадаўстве, асаблівасці правапрымяняльнай практыкі, якія не дазваляюць у поўнай меры рэалізаваць заканадаўчыя акты ў той ці іншай сферы — хай гэта будзе адукацыя, культура або ахова здароўя».*

# ПАЗАЛОТЧЫКІ ПЕРАМОГІ



На плошчы Перамогі ў Мінску ідзе рэканструкцыя комплексу-помніка. Ужо пачалася падрыхтоўка верхняй часткі галоўнага манумента — зоркі, якая ўвасабляе ордэн Перамогі. Брыгада рэстаўратараў прадпрыемства «Белрэстаўрацыя» пад кіраўніцтвам Мікалая ЛЁЛІ цяпер вядзе ачыстку металічных дэталяў і мазаікі зоркі перад нанясеннем пазалоты. Дарэчы, работы ідуць на вышыні сарака метраў (абеліск мае вышыню трыццаць восем метраў плюс тры метры сама зорка). Для брыгадзіра Мікалая Лёлі гэта ўжо другая рэстаўрацыя на плошчы Перамогі: шаснаццаць гадоў таму ён працаваў у брыгадзе пазалотчыкаў, якой кіраваў яго бацька — вядомы ў краіне рэстаўратар-пазалотчык Мікалай Кузьміч Лёля. З цягам часу сын сам стаў на чале калектыву рэдкай спецыяльнасці. Цяпер у брыгадзе працуе сын Мікалая Елісей Лёля, а таксама пляменнік Андрэй Завала — можна сказаць, сямейная дынастыя пазалотчыкаў. Яшчэ ў складзе брыгады выдатныя спецыялісты Мікалай Баранаў, у якога гэта таксама другая рэстаўрацыя помніка на плошчы Перамогі, і Алесь Клімашонак. Усе яны прысутнічаюць на гэтым фота. Брыгадзір Мікалай Лёля — на першым плане.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Каля 400 назіральнікаў увойдзе ў місію ад СНД на парламенцкіх выбарах у Беларусі.**
- Эмблему ЧС-2022 па футболе прадставілі ў Катары.




- **У Беларусі адкрылі першы ў СНД камп'ютарны клас для людзей з парушэннем зроку.**
- Міністэрства інфармацыі выдала дазвол на вяшчанне на тэрыторыі Беларусі двум замежным тэлевізійным каналам: «Заграднае жыццё HD» і «Таямніцы Галактыкі HD».
- **Музей гісторыі ВАВ прадставіць экспазіцыю да 80-годдзя пачатку Другой сусветнай вайны.**
- Аркестр Міхаіла Фінберга правядзе свята камернай і духоўнай музыкі ў Тураве.

Брэст 1000 год!

# ГОРАД І ЛЮДЗІ

## Хто праслаўляў Брэст на працягу тысячагоддзя




Фота БелТА.

**У гэтыя выхадныя самы заходні горад Беларусі завабіць да сябе незлічоную колькасць гасцей на мерапрыемствы з нагоды юбілею. 1000 гадоў — дата своеасаблівая. З аднаго боку, яна патрабуе падвядзення прамежкавых вынікаў. А Брэст за гэты час сапраўды здабыў нямала. У той жа момант нельга забываць імёны тых, хто ўплываў на развіццё і станаўленне горада — ад старажытнасці і да нашых дзён. «Звязда» прыгледзелася да біяграфіі юбіляра і склала спіс славутых асоб у яго гісторыі.**

СТАР. 13

Гэта лепш ведаць

# Мы сталі больш сябе страхаваць

### А з пачаткам восені робім гэта на новых умовах

**З 1 верасня ўступіў у сілу Указ Прэзідэнта № 175 «Аб страхаванні», якім унесены змяненні ў заканадаўства аб страхаванні. Пра гэта расказала гендырэктар Беларускай асацыяцыі страхоўшчыкаў Ірына МЕРЗЛЯКОВА.**

Дакумент прадугледжвае лібералізацыю ўмоў ажыццяўлення страхавой дзейнасці, пашырэнне магчымасцяў па заключэнні дагавораў страхавання ў электронным выглядзе і зніжэнне страхавых тарыфаў па асобных відах абавязковага страхавання. Значныя змяненні таксама закранулі сегмент страхавання жыцця і абавязковага страхавання грамадзянскай адказнасці ўладальнікаў транспартных сродкаў.

Спецыяліст таксама адзначыла, што флагманамі росту страхавога рынку ў першым паўгоддзі сталі страхаванне жыцця і добраахвотнае медыцынскае страхаванне. Сегмент страхавання не жыцця павялічыўся ў першым паўгоддзі на 11 %, сегмент страхавання жыцця — на 31 %. Што датычыцца рызыкоўных відаў страхавання, там драйверам з'яўляецца Каска. Доля добраахвотных відаў страхавання дасягнула амаль 63 %.

Эксперт таксама нагадала, што з верасня страхавыя арганізацыі атрымалі права заключаць дагаворы страхавання ў электронным выглядзе, а страхавальнікі (юрыдычныя асобы) могуць уключаць у выдаткі, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні, страхавыя ўзносы па дагаворах добраахвотнага страхавання жыцця і дадатковай пенсіі, заключаных са страхавымі арганізацыямі незалежна ад формы ўласнасці.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

# БАЛАНС ЯК УМОВА БЯСПЕКІ

**Кіраўнік дзяржавы прыняў з дакладам дзяржаўнага сакратара Савета бяспекі Рэспублікі Беларусь Станіслава Зася.**

Першы блок пытанняў размовы з Прэзідэнтам датычыўся вынікаў нядаўняй нарады, якую Аляксандр Лукашэнка правёў з кіраўнікамі праваахоўных ведамстваў Беларусі.

— Тэма бяспекі цяпер у цэнтры ўвагі, і дзякуючы ёй Мінск сёння трапіў, як журналісты кажуць, у топ навін у сувязі з канферэнцыяй, якую ў нас праводзіць Арганізацыя Аб'яднаных Нацый, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. — Я толькі што сустракаўся з намеснікам генсека гэтай арганізацыі, абмяркоўваў гэтыя праблемы ў сувязі з нашымі ініцыятывамі, якія па даручэнні высокіх службовых асоб, урада агучыў у сваім выступленні (на Міжнароднай антытэрарыстычнай канферэнцыі ў Мінску. — **«Звязда»**). Тэма гэта аказалася актуальная не толькі ў Беларусі, але і ў Еўропе, у цэлым на міжнароднай арэне.

Разам з тым мы жывём у канкрэтных умовах, сказаў Аляксандр Лукашэнка і папрасіў дзяржаўнага сакратара даць ацэнку сітуацыі з бяспекай беларускіх грамадзян і рабоце праваахоўных органаў.

Другі блок пытанняў, якія Прэзідэнт абмеркаваў з дзяржсакратаром Савета бяспекі, датычыўся вынікаў нядаўніх перагавораў, у якіх Станіслаў Зась разам з калегамі з іншых краін удзельнічаў у Варшаве.

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся і тым, на якім узроўні цяпер у Беларусі дыялог па тэме бяспекі з Расійскай Федэрацыяй. Ён заўважыў, што менавіта ў саюзе з Расіяй Беларусь вырашае галоўныя пытанні ў гэтай сферы. «Вы апошнім часам мелі нямала кантактаў не толькі з кіраўнікамі адпаведных структур ЕАЭС, СНД, але і з Патрушавым (сакратар Савета бяспекі Расійскай Федэрацыі. — **«Звязда»**), ведаю, што ў найбліжэйшы час ён прыедзе ў Беларусь і мы зможам працягнуць гэты дыялог», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Пазней Станіслаў Зась расказаў журналістам, што далажыў Прэзідэнту пра пэўныя карэкціроўкі ў рабоце праваахоўных органаў. «Па-першае, тыя ўстаноўкі, якія былі дадзены на нарадзе, даведзеныя па ўсёй вертыкалі па кожным ведамстве да выканаўцаў, — паведаміў ён. — Па-другое, прайшло прадметнае абмеркаванне паднятых пытанняў у кожным ведамстве. Задачы, пастаўленыя кіраўніком дзяржавы, былі дэталізаваныя».

Дзяржсакратар дадаў, што Аляксандр Лукашэнка патрабаваў ажыццявіць жорсткі кантроль за прыняццем мер па негатыўных фактах, якія былі агучаны на нарадзе.

«Кожны работнік ведамства павінен пачуць дакладны сігнал: працаваць, ігнаруючы прынятыя правілы, законы, нельга. Працаваць па паняццях, як табе зручна і хочацца, недапушчальна, — патлумачыў Станіслаў Зась. — Ёсць пэўныя рамкі, усе павінны іх трымацца. Перш за ўсё людзі, якія носяць пагоны».

Прэзідэнт звярнуў увагу, што вынікі нарады аб рабоце праваахоўных органаў не павінны сысці на нішто, расказаў дзяржсакратар Савета бяспекі. «Такога не будзе. Працэс гэты не аднамомантны. Але карэкціроўкі ўжо адбываюцца, і негатыўным фактам дадзеная адпаведная прававая альбо службовая ацэнка. І работа будзе працягнута», — запэўніў Станіслаў Зась.

Кіраўніку дзяржавы таксама было далажана пра завяршэнне падрыхтоўкі да восеньскіх стратэгічных вучэнняў сумесна з Расійскай Федэрацыяй.

«Прэзідэнт звярнуў увагу на стан тэхнікі і ўзбраенняў, асабліва тых, што знаходзяцца на захаванні, гэтае пытанне вельмі важнае для Узброеных Сіл», — дадаў суразмоўца і паведаміў, што ў хуткім часе Аляксандр Лукашэнка праінспектуе стан такой тэхнікі і ўзбраенняў.

Станіслаў Зась таксама сказаў журналістам, што Беларусь прыняла запрашэнне ў Варшаву на сустрэчу па пытаннях бяспекі, бо палічыла гэта карысным. «Там былі праведзены і двухбаковыя сустрэчы з маімі калегамі з Украіны і Польшчы, і сумесная сустрэча ў фармаце чатырох кіраўнікоў. Абмяркоўваліся пытанні, актуальныя для ўсіх нас у гэтым рэгіёне, — пытанні забеспячэння бяспекі. Закраналіся і больш глабальныя пытанні, у прыватнасці па ракетах сярэдняй і меншай далёкасці, пра перспектывы дагавора СНУ-ІІІ (паміж Расіяй і ЗША аб мерах па далейшым скарачэнні і абмежаванні стратэгічных наступальных узбраенняў. — **«Звязда»**). І іншыя тэмы, якія датычацца і нераспаўсюджання ядзерных матэрыялаў, і трансгранічнай злачыннасці, і інфармацыйнай бяспекі», — праінфармаваў прадстаўнікоў СМІ дзяржсакратар.

Ён нагадаў, што ў Беларусі з ЗША існуе сумесная праграма па нераспаўсюджанні ядзерных матэрыялаў, дзякуючы якой наша краіна аснасціла свае пункты пропуску адпаведнай тэхнікай і апаратурай. На сустрэчы ў Варшаве Беларусь прапанавала працягнуць работу гэтай праграмы і пашырыць яе на ўвесь рэгіён, у тым ліку на Украіну і Польшчу.

«Ішла размова і наконт узаемадзеяння Беларусі з НАТА. Мы пацвярджаем, што зацікаўленыя ў развіцці гэтага супрацоўніцтва. Вітаем, што зняты абмежаванні на кантакты прадстаўнікоў высокага ўзроўню паміж блокам НАТА і нашай краінай. Гатовы і далей рэалізоўваць тое, што будзе адпавядаць нашым інтарэсам», — дадаў Станіслаў Зась. Ён паведаміў таксама, што на сустрэчы ў Варшаве абмяркоўвалася і ўкраінская праблематыка, у прыватнасці, ішла гутарка пра магчымасць пашырэння перамоўнага працэсу, далучэння да яго ЗША. «Беларусь пацвердзіла сваю пазіцыю ў тым, што мы бачым толькі адзін шлях урэгулявання канфлікту — палітычнымі і дыпламатычнымі метадамі», — падкрэсліў дзяржсакратар.

Станіслаў Зась пацвердзіў, што на будучым тыдні адбудзецца візіт у Беларусь сакратара Савета бяспекі Расійскай Федэрацыі Мікалая Патрушава. «Гэта планавая паездка, яна не звязаная з нейкімі міжнароднымі падзеямі або сустрэчай у Варшаве, — запэўніў ён. — Яна планавалася загадзя». Станіслаў Зась падкрэсліў, што Расія — стратэгічны саюзнік і партнёр Беларусі і ўзаемаадносіны нашай краіны ні з блокам НАТА, ні з іншымі суседзямі не шкодзяць супрацоўніцтву з Расійскай Федэрацыяй.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# АКТЫЎНАЯ РОЛЯ БЕЛАРУСІ ВЕЛЬМІ ВАЖНАЯ

**Пра гэта на сустрэчы з Прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам сказаў намеснік Генеральнага сакратара ААН, кіраўнік контртэрарыстычнага ўпраўлення ААН Уладзімір Варанкоў.**

Кіраўнік дзяржавы падзякаваў прадстаўніку ААН за высокі ўзровень арганізацыі міжнароднай антытэрарыстычнай канферэнцыі, якая гэтымі днямі праходзіць у Мінску. Ён заўважыў, што водгукі ў сродках масавай інфармацыі з нагоды арганізацыі форуму і яго зместу розныя, але без негатыву — у станоўчым ключы. Гэта гонар для любой краіны — прымаць такую канферэнцыю», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што Беларусь цалкам апраўдае аказаны давер і будзе рабіць усё, каб прытрымлівацца курсу, які абазначаны ўдзельнікамі канферэнцыі. «Мы будзем старацца, вы падказвайце, усё ж такі інфармацыі ў вас у гэтым плане больш, чым у Беларусі. Падказвайце, карэктуйце, каардынуйце, накіроўвайце дзейнасць нашых органаў улады, — прапанаваў кіраўнік дзяржавы. — Гэта будзе на карысць узаемаадносінам паміж Беларуссю і Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый і ўвогуле добры ўнёсак у барацьбу з тэрарызмам ва ўсім свеце».

Уладзімір Варанкоў, у сваю чаргу, выказаў падзяку Прэзідэнту Беларусі, у тым ліку за яго выступленне на канферэнцыі. «Гэта быў вельмі моцны сігнал міжнароднай супольнасці згуртавацца ў барацьбе з тэрорам. Тэрор застаецца адной з асноўных сусветных праблем, і, каб яго перамагчы, трэба дзейнічаць шматкомплексна. І вось гэтая частка барацьбы — супраць выкарыстання тэрарыстамі высокіх тэхналогій, інтэрнэту — яна становіцца ўсё больш і больш вырашальнай», — сказаў ён.

На гэта Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ўжо з'яўляюцца небяспечныя сімптомы выхаду тэрарызму з-пад кантролю. «Калі тэрарысты возьмуць верх і пачнуць дыктаваць кіраўнікам дзяржаў сваю палітыку з улікам сучасных тэхналогій (а яны навучыліся прыстасоўвацца і часам хутчэй за нас рэагуюць на некаторыя рэчы, звязаныя з высокімі тэхналогіямі), вось тады будзе зусім дрэнна, тады ніякія не тое што канферэнцыі, ужо практычныя дзеянні не дапамогуць», — папярэдзіў Прэзідэнт.

### У тэму

Контртэрарызм з'яўляецца адным з прыярытэтаў усіх дзяржаў на сённяшнім этапе, бо тэрарызм — рэальная пагроза чалавецтву, сказаў журналістам пасля сустрэчы з кіраўніком дзяржавы Уладзімір Варанкоў.

«І тое, што Беларусь актыўна працуе на гэтым кірунку дзейнасці ААН, сведчыць пра тое, што яна працягвае выконваць ролю аднаго з лідараў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Мы памятаем, што Беларусь была ў складзе заснавальнікаў ААН, і гэта традыцыя актыўнай работы працягваецца, і контртэрарыстычны кірунак гэтаму пацвярджэнне», — дадаў ён.

Уладзімір Варанкоў назваў антытэрарыстычную канферэнцыю ў Мінску вельмі важнай міжнароднай падзеяй. «Размова на ёй ідзе пра тое, як супрацьдзейнічаць спробам тэрарыстаў прыцягнуць для сваёй дзейнасці новыя тэхналогіі, выкарыстоўваць інтэрнэт для вярбоўкі, для атрымання сродкаў. Калі мы не дасягнем поспехаў у гэтай сферы, перамагчы тэрарызм не зможам, — заявіў кіраўнік контртэрарыстычнага ўпраўлення ААН. — Гэта вастрыня, пік. І Беларусь — адзін з лідараў працэсу супрацьстаяння».

Ён згадаў выказаную на канферэнцыі Аляксандрам Лукашэнкам думку пра тое, што толькі аб'яднанне намаганняў і ўзмацненне салідарнасці ўсіх дзяржаў у барацьбе з тэрорам могуць прывесці да поспеху. «Гэта будзе цяжкая барацьба, але такія мерапрыемствы, як тое, што зараз праходзіць у сталіцы Беларусі, працуюць на гэту кансалідацыю», — акцэнтаваў прадстаўнік ААН.

Беларускі лідар дадаў, што сёння ўсе змагаюцца супраць ядзернай зброі, супраць яе распаўсюджвання, бескантрольнасці, у той жа час некаторыя ядзерныя дзяржавы дзеляцца тэхналогіямі ў гэтай сферы з асабліва блізкімі краінамі і ваююць супраць нежаданых. «Гэта таксама дрэнна. Пацяху, пацяху ядзерная зброя распаўзаецца, але гэта будуць «семачкі» ў параўнанні з тым, што можа быць: лекі, прадукты харчавання, біялагічная зброя самых высокіх тэхналогій, відаў і тыпаў, што пракантраляваць будзе практычна немагчыма, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — А тэрарысты хутка скарыстаюцца гэтымі найноўшымі тэхналогіямі, каб змагацца па ўсіх франтах супраць нармальных людзей. Вось гэта не будзе паддавацца кантролю, як ядзерная зброя».

Кіраўнік дзяржавы заклікаў глядзець на абазначаную праблему больш шырока. Уладзімір Варанкоў у адказ згадаў прапанову Прэзідэнта Беларусі аб стварэнні міжнароднай кааліцыі па барацьбе з тэрорам, якую Аляксандр Лукашэнка выказаў на сесіі адкрыцця Міжнароднай антытэрарыстычнай канферэнцыі ў Мінску.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# ГАЛОЎНАЯ ЗАДАЧА — ДЫВЕРСІФІКАВАЦЬ ЭКСПАРТ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду з членамі ўрада па актуальных пытаннях развіцця эканомікі краіны і супрацоўніцтва з Расіяй.**

«Усім зразумела, што апошнія месяцы, чацвёрты квартал любога года — гэта выпрацоўка планаў развіцця краіны на будучыню, — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да членаў урада. — Перш за ўсё планаванне на будучы год вытворчасці, ды і ўвогуле ўсяго нашага жыцця. Я не адзін раз казаў, што цяперашні і наступны — гэта гады асаблівыя — парламенцкія і прэзідэнцкія выбараў. Мы здаём экзамен. Таму ўсюды павінны падцягнуцца як належыць».

Прэзідэнт чарговы раз звярнуў увагу ўрада на неабходнасць пошуку новых рынкаў для экспарту айчыннай прадукцыі. «Гэта самая галоўная задача — дыверсіфікаваць рынкі збыту, не страціўшы прыбытковасць пры продажы нашай прадукцыі. Так, мы рухаемся ў гэтым кірунку, але вельмі марудна», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Залежнасць ад адной краіны, няхай гэта і брацкая Расія, застаецца занадта вялікай. «Зразумела, што і залежнасць нашай краіны ад паставак, перш за ўсё вуглевадароднай сыравіны з Расіі, вельмі вялікая. І мы заўсёды гэта ўлічваем. Таму пытанне супрацоўніцтва з Расіяй, канчатковых прапаноў па далейшым супрацоўніцтве ў рамках перагаворнага працэсу і выпрацоўкі праграмы дзеянняў застаецца актуальным. І гэта пытанне мы сёння павінны абмеркаваць, — акрэсліў Прэзідэнт. — Трэба дакладна спланаваць, па якіх кірунках, як будзем развівацца, і вызначацца».

Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў удзельнікаў эканамічнай нарады, што планы, якія былі намечаны, павінны быць выкананы без агаворак. «Мы з вамі спланавалі, я зацвердзіў гэтыя планавыя заданні з вашай падачы, і выканаць мы іх абавязаны. Гэта задача не толькі кожнага чыноўніка нашай краіны, але і кожнага грамадзяніна Беларусі».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# «Гарачая» гідраўліка трубаправода АЭС

**На першым энергаблоку Беларускай атамнай электрастанцыі выканалі гідраўлічныя выпрабаванні трубаправодаў і абсталявання першага контуру на трываласць і шчыльнасць ціску 24,5 МПа.**

Цяпер спецыялісты прыступілі да выпрабаванняў сістэм бяспекі на ўшчыльненых першы контур. У першай дэкадзе верасня пройдуць гідраўлічныя іспыты на трываласць і шчыльнасць трубаправода і абсталявання другога контуру.

— Высокая гатоўнасць блока дазволіла нам выканаць "гарачую" гідраўліку трубаправодаў і абсталявання першага контуру на падэтапе А-1 (выпрабаванне і апрабаванне абсталявання) этапнай праграмы перадпускавых наладачных работ энергаблока № 1 практычна на адным дыханні, — зазначыў **Віталь ПАЛЯНІН, віцэ-прэзідэнт — дырэктар праекта па стварэнні Беларускай АЭС інжынірынгавай кампаніі АСЭ.** — Выпрабаванні занялі крыху больш за суткі.

Беларуская АЭС з двума рэактарамі магутнасцю 2400 МВт будуецца па расійскім праекце пакалення 3+, які цалкам адпавядае міжнародным нормам бяспекі і рэкамендацыям Міжнароднага агенцтва па атамнай энергетыцы (МАГАТЭ).

**Ірына СІДАРОК.**

Блізкая ўлада

# ПАЗБЕГНУЦЬ СУДОВЫХ ПАМЫЛАК...

## Уладзімір Краўцоў правёў прыём грамадзян

**Звароты датычыліся тэм, якія маюць рэзананс у грамадстве. У першую чаргу, гэта судовыя справы, работа праваахоўных органаў. Другой важнай тэмай зваротаў да кіраўніка Гродзенскага аблвыканкама можна назваць захаванне гісторыка-культурнай спадчыны.**


Фота БелТА.

Сваю праблему агучыў гродзенец Анатоль Мікалаевіч, сын якога асуджаны раённым судом Гродна за хабар. На думку бацькі, справа была неабгрунтавана зацягнута, следства вялося два гады. На працягу гэтага тэрміну на сына, па словах Анатоля Мікалаевіча, аказваўся ціск, праводзіліся лішнія мерапрыемствы, у якія былі ўцягнуты дачка і зяць. Таксама мужчына не разумее, навошта праводзіць столькі вобыскаў, у тым ліку ў кватэры дачкі, якая не мае дачынення да спраў свайго брата. Праз меру вялікім, на думку Анатоля Мікалаевіча, з'яўляецца і сам прысуд — чатыры гады пазбаўлення волі.

Падчас прыёму яму паведамілі, што скарга цяпер разглядаецца ў абласным судзе, які мае паўнамоцтвы змяніць кваліфікацыю прысуда раённага суда альбо наогул яго адмяніць. Разам з тым абласны суд можа пакінуць вынесены прысуд без змяненняў. У гэтым выпадку ўдзельнікі працэсу змогуць звярнуцца ў Вярхоўны суд. Заканадаўства дае права перагледзець справу.

— Хоць да хабару ў грамадстве ставяцца вельмі жорстка, асабліва калі справа датычыцца дзяржаўных служачых, нямала пытанняў апошнім часам узнікае да самых праваахоўных органаў, пра што нядаўна казаў кіраўнік дзяржавы. Гэта датычыцца ў тым ліку і мясцовых сілавых структур, — адзначыў Уладзімір Краўцоў.

На яго думку, неабходна на месцах удасканальваць работу праваахоўнай сістэмы. Бо недахопы, на якія ўказваў кіраўнік краіны, якраз і праяўляюцца ў выглядзе зваротаў.

— Трэба падыходзіць больш уважліва. Бачыць перад сабой не патэнцыйнага злачынца, а чалавека, — заўважыў падчас прыёму Уладзімір Краўцоў. — Памылка ў рабоце праваахоўных органаў можа зламаць лёс чалавеку. Таму гэтыя пытанні таксама трэба адсочваць і, калі неабходна, пераглядаць.

Не адну інстанцыю прайшла пенсіянерка з Гродна Любоў Мікалаеўна. Яна лічыць, што ёй недалічылі пенсію, бо яе калегі, з якімі жанчына працавала ў шкодных умовах на прадпрыемстве хімічнай вытворчасці, атрымліваюць на 85 рублёў больш. Разам з тым яна паведаміла, што выязджала працаваць у Германію.

Зварот гродзенкі разглядаўся камітэтам па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва аблвыканкама. Усе перыяды стажу, якія павінны былі ўвайсці, налічаны, у тым ліку і дзевяць гадоў працы ў шкодных умовах. Скаргу разбіралі і ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны. Адтуль быў дадзены адказ, што ўсё налічана ў адпаведнасці з заканадаўствам. Гэта пацвердзіў таксама і раённы суд. У сваю чаргу, сацыяльныя органы запэўнілі, што дапамагаюць адзінокай жанчыне, ёй штогод аказваецца матэрыяльная дапамога, рабіўся рамонт. Уладзімір Краўцоў прапанаваў перагледзець справу разам з самой жанчынай і растлумачыць ёй, як вядзецца налічэнне пенсіі.

А вось кіраўнік грамадскай арганізацыі «Смаргонь франтавая» хвалюе праблема захавання гістарычнай спадчыны. Ігар Аляксандравіч звярнуўся да старшыні аблвыканкама з канкрэтнай просьбай — аказаць дапамогу ва ўстаноўцы памятнага знака. Ён расказаў, што грамадская арганізацыя вядзе работу над стварэннем музея пад адкрытым небам — у прыватнасці, увекавечваннем памяці жаночага батальёна пад камандаваннем Марыі Бачкаровай. Мастацкі фільм «Батальён», зняты расійскімі кінематаграфістамі, якраз пра гэтыя падзеі. Як вядома, першае баявое хрышчэнне батальён атрымаў пад Смаргонню, каля вёскі Навваспаск. На аснове архіваў была знойдзена траншэя, дзе жанчыны-воіны адбілі 14 нямецкіх атак.

Гэты подзвіг варта ўвекавечыць памятным знакам, лічыць Ігар Аляксандравіч. Два гады таму вызначана і месца для ўстаноўкі. Абгрунтаванне пацвердзіла Акадэмія навук Беларусі, ёсць гістарычная даведка. Эскізы прайшлі ўзгадненне. Праз «народную» платформу краўдфандынгу сабраны сродкі на манумент, які будзе ў выглядзе вялікага каменя. Праектам прадугледжаны ўкладка пліткі, асвятленне, паркоўка, але на добраўпарадкаванне сродкаў не хапае.

Уладзімір Краўцоў адзначыў, што не супраць таго, каб падтрымаць ідэю грамадскай арганізацыі. Тым больш што яна працягвае стварэнне ў Смаргонскім раёне абарончай лініі «Залатая горка». У самім горадзе ўстаноўлены мемарыял, прысвечаны Першай сусветнай вайне.

— Пытанні гісторыі і культуры сёння асабліва клапоцяць нашых грамадзян, — падкрэсліў Уладзімір Краўцоў. — Людзі неабыякавыя да нашай гісторыі, культуры, да малой радзімы. Мы бачым, як грамадскія арганізацыі ажыццяўляюць гэту дзейнасць, не толькі чакаюць каманды зверху, але і самі ініцыююць многія праекты. І правільна робяць. У нас шмат памятных месцаў, якія трэба прыводзіць у парадак, узнаўляць, каб пакінуць нашчадкам.

На словах старшыні аблвыканкама, такія турыстычныя мясціны вабяць турыстаў, што спрыяе пашырэнню бязвізавых зон. Дарэчы, Смаргонь могуць наведаць турыстычныя групы без віз, хоць сам раён не падпадае пад бязвізавую зону.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Кліматычны баланс

# НАПРАМАК — НІЗКАВУГЛЯРОДНАЯ ЭКАНОМІКА

**Спецыялісты расказалі, якія папераджальныя меры сёння прадпрымаюцца і плануюцца ў будучым па прадухіленні і змякчэнні негатыўных уздзеянняў змены клімату на розныя галіны народнай гаспадаркі.**

Як расказала **намеснік начальніка Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана КУЗЬМІЧ,** за этап павышэння сярэднегадавой тэмпературы паветра, які цягнецца ў нашай краіне з 1989 года, яна ўзрасла на 1,3 градуса. Самым цёплым за ўсю гісторыю метэаназіранняў стаў 2015 год: сярэднегадавая тэмпература склала +8,5 $^0$С пры норме +6,7 $^0$С, а лета 2010 года пабіла рэкорды па колькасці гарачых дзён і працягласці гарачыні.

21 верасня 2016 года Беларусь стала ўдзельніцай Парыжскага пагаднення да Рамачнай канвенцыі ААН аб змене клімату. Тым самым краіна прыняла на сябе абавязацельствы скараціць да 2030 года выкіды парніковых газаў не менш чым на 28 % да ўзроўню 1990 года.

Па словах **начальніка ўпраўлення рэгулявання ўздзеяння на атмасфернае паветра, змены клімату і экспертызы Мінпрыроды Наталлі АЛЕЙНІКАВАЙ,** каб выканаць гэтыя абавязацельствы, плануецца ўзмацніць палітыку краіны ў вобласці аднаўляльных крыніц энергіі; укараніць нізкавугляродныя і безвугляродныя тэхналогіі; устанавіць біягазавыя ўстаноўкі на ўсіх буйных комплексах па вырошчванні буйной рагатай жывёлы, свінакомплексах, птушкафабрыках; укараніць комплексныя сістэмы выкарыстання біягазу, энергіі сонца, ветру для аграгарадкоў; павялічыць выкарыстанне долі электратранспарту і вывесці з эксплуатацыі транспарт, што працуе на бензінавых ці дызельных матарах, нізкіх экалагічных класаў і іншае.

Па словах эксперта, распрацоўваецца комплексная праграма па пераводзе ўсяго грамадскага транспарту ў буйных гарадах на электрычнасць. Сёння ў Беларусі інтэнсіўна развіваецца пасажырскі электратранспарт: тралейбусы, трамваі, электрацягнікі. На вуліцах беларускіх гарадоў (пакуль пераважна Мінска) працуюць 83 адзінкі электробусаў. Ёсць у нас і ўласныя распрацоўкі электрамабіляў.

— Адна з перашкод павелічэння долі электратранспарту ў нашай краіне і суседзяў — абмежаванні магчымасці трансгранічнага перамяшчэння, — лічыць Наталля Алейнікава. — Як мы едзем на сваім аўтамабілі ў Літву, Латвію, Польшчу, Украіну, Расію, гэтак жа мы павінны сесці на электрамабіль і паехаць у тыя ж краіны, ведаючы, што ў любым месцы знойдзем запраўвачную станцыю для свайго транспартнага сродку і зможам пры неабходнасці яго адрамантаваць. Неабходна каардынацыя намаганняў краін па фарміраванні гэтай інфраструктуры. Мы лічым, што Беларусь змагла б выступіць такім каардынатарам у нашым рэгіёне.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Politico: ЗША спрабавалі завербаваць інфарматараў сярод супрацоўнікаў Huawei

Тэлекамунікацыйная кампанія Huawei сцвярджае, што ўрад ЗША рабіў спробы завербаваць інфарматараў сярод яе супрацоўнікаў. Пра гэта паведаміла газета Politico са спасылкай на ўнутраныя дакументы кампаніі, якія трапілі ў яе распараджэнне.

Па звестках газеты, прадстаўнікі ўрада ЗША вялі шырокую кампанію, спрабуючы рэкрутаваць супрацоўнікаў Huawei. У прыватнасці, ціск мог быць аказаны на работнікаў кітайскай фірмы, якія звярталіся па амерыканскую візу. Акрамя таго, амерыканцы вывучалі змесціва тэлефонаў і ноўтбукаў супрацоўнікаў Huawei у пошуках кампраметуючай інфармацыі аб кампаніі, калі яны праходзілі пашпартны кантроль па прыбыцці ў ЗША. Амерыканскія агенты таксама спрабавалі выдаваць сябе за былых супрацоўнікаў Huawei, каб увайсці ў давер.

### Іран вернецца да выканання ядзернай здзелкі, калі атрымае крэдыт на $15 млрд



Намеснік кіраўніка іранскага МЗС Абас Арагчы заявіў, што Тэгеран вернецца да поўнага захавання Сумеснага ўсёабдымнага плана дзеянняў па іранскай ядзернай праграме пры ўмове атрымання крэдыту ў памеры $15 млрд.

«З нашага пункту гледжання, вяртанне да поўнага выканання ядзернай здзелкі залежыць ад таго, ці атрымаем мы крэдыт у памеры $15 млрд на працягу чатырох месяцаў. У адваротным выпадку мы працягнем скарачэнне абавязацельстваў па ядзернай здзелцы», — цытуе Арагчы агенцтва Fars. Паводле яго слоў, пазіцыя Ірана заключаецца ў тым, што «Еўропа павінна купляць іранскую нафту або даць Тэгерану эквівалент у выглядзе крэдытнай лініі, якая забяспечана нафтавымі пастаўкамі, што фактычна азначае папярэдні продаж нафты», — падкрэсліў намеснік кіраўніка МЗС.

«Пасля атрымання крэдыту ў памеры $15 млрд Іран гатовы працягнуць перагаворы з групай 4+1 (РФ, Вялікабрытанія, Германія, Кітай і Францыя), аднак па змесце гэтага дыялогу захоўваюцца рознагалоссі», — дадаў Арагчы.

### Рак стаў асноўнай прычынай смерцяў у развітых краінах



Ракавыя захворванні сталі асноўнай прычынай смяротнасці ў краінах з высокім узроўнем даходаў насельніцтва. Да такой высновы прыйшла міжнародная група вучоных, вынікі даследавання апублікаваны ў навуковым часопісе The Lancet.

Аўтары даследавання вырашылі высветліць, як адрозніваюцца найбольш распаўсюджаныя захворванні, якасць лячэння і смяротнасць у краінах з высокім, сярэднім і нізкім узроўнем даходаў насельніцтва. Для гэтага яны прааналізавалі даныя 160 тысяч чалавек ва ўзросце ад 35 да 70 гадоў з 21 краіны свету за апошнія 10 гадоў. Аказалася, што ў краінах з высокім даходам насельніцтва рак як прычына смяротнасці амаль удвая перавысіў сардэчна-сасудзістыя захворванні, якія раней займалі першае месца ў спісе прычын смяротнасці. Сардэчна-сасудзістыя захворванні засталіся на першым месцы сярод прычын смяротнасці ў краінах з нізкім узроўнем даходу.

Самай жа частай прычынай смерці ў свеце сёння пакуль з'яўляюцца хваробы сэрца. У 2017 годзе на іх долю прыйшлося 40 % смяротных зыходаў.

Гучная справа

# Налёт на «Яхант» раскрыты

**17 жніўня сярод дня была абрабавана ювелірная крама «Яхант», што месціцца ў самым цэнтры Мінска. Злачынцы распылілі ў магазіне пярцовы газ, а пасля звязалі рукі прадаўцам пластыкавай сцяжкай. Урон, нанесены краме падчас разбойнага нападу, быў ацэнены больш чым у адзін мільён рублёў. Налётчыкі вынеслі больш за тысячу вырабаў! І вось 3 верасня для меркаваных налётчыкаў каляндар перавярнуўся ў літаральным сэнсе гэтага слова — ім давялося развітацца са свабодай.**

— Адразу пасля нападу была створана аператыўная група, у якую ўвайшлі найбольш дасведчаныя спецыялісты, — зазначыў **начальнік ГУУС Мінгарвыканкама Іван КУБРАКОЎ.** — Супрацоўнікі МУС зрабілі велізарную работу па высвятленні асоб, якія мелі дачыненне да нападу, па тэрыторыі ўсёй краіны. Былі дні, калі супрацоўнікі крымінальнага вышуку мелі на адпачынак не больш за тры гадзіны.

Падазраваныя вельмі дасканала рыхтаваліся да рабунку. Яны рабілі максімальныя захады для таго, каб не пакінуць сляды на месцы злачынства.

У іх дамах прайшлі ператрусы. Частку выкрадзеных каштоўнасцяў міліцыянеры знайшлі ў схронах. Адшукаліся і пластыкавыя сцяжкі — аналагічныя тым, якімі звязвалі рукі прадаўцоў. Прызначаны шэраг судовых экспертыз.

— Па факце злачынства заведзена крымінальная справа па артыкуле 207 Крымінальнага кодэкса — «Разбой», — паведаміў **начальнік упраўлення Следчага камітэта па Мінску Дзмітрый КАНАПЛЯНІК.** — Трое падазраваных ужо дапытаны. Яны прызналі сваю датычнасць да гэтага злачынства. Усе яны — жыхары Мінска, не працуюць. Адзін з іх раней судзімы.

Следства цяпер, сярод іншага, правярае датычнасць затрыманых да іншых злачынстваў. Дзмітрый Канаплянік зазначыў, што яны могуць мець дачыненне да трох нападаў на жылыя прыватныя дамы, якія адбыліся ў сталіцы сёлета і летась.

— Але ёсць пытанні і да бяспекі самой крамы, — адзначае ён. — Асобныя яе патрабаванні былі праігнараваны як супрацоўнікамі магазіна, так і адміністрацыяй. З гэтай нагоды будзе ўнесена асобнае прадстаўленне.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# Мы сталі больш сябе страхаваць

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дакументам дазваляецца ажыццяўляць выплату кошту аднаўленчага рамонту пашкоджаных у ДТЗ транспартных сродкаў без уліку ступені зносу пашкоджаных дэталяў рулявога кіравання, тармазной сістэмы, сістэм актыўнай бяспекі па пераліку, які зацвярджаецца Беларускім бюро па транспартным страхаванні.

**Пры гэтым павялічаны ліміт страхавога пакрыцця пры афармленні ДТЗ без выкліку ДАІ з 400 да 800 еўра,** што спросціць афармленне дарожных здарэнняў для ўладальнікаў транспартных сродкаў і знізіць нагрузку на органы ўнутраных спраў.

Адначасова зніжаны памеры страхавых узносаў і тарыфаў па асобных відах абавязковага страхавання (напрыклад, будынкаў, якія належаць грамадзянам, а таксама грамадзянскай адказнасці ўладальнікаў электрамабіляў і гібрыдных аўтамабіляў, перавозчыкаў перад пасажырамі, рыэлтараў і часовых антыкрызісных кіраўнікоў).

Па звестках Міністэрства фінансаў, за сем месяцаў года ўзносы страхавых арганізацый краіны па страхаванні склалі 810,4 млн рублёў. Тэмп росту страхавых узносаў за гэты час склаў 114,9 %.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Будзь у курсе!

## У ПАГРАНІЧНЫХ ЗНОСІНАХ — ЗМЯНЕННІ

**Змяніўся парадак курсіравання цягнікоў пагранічных зносін Брэст — Цярэспаль — Брэст.**

Так, з 2 верасня прызначаны ў штодзённае курсіраванне цягнік міжнародных ліній № 121/122 Брэст — Цярэспаль — Брэст. Ён быў адменены з прычыны правядзення рамонтных работ на тэрыторыі Польскай чыгункі.

Цягнік № 121 Брэст — Цярэспаль будзе адпраўляцца са станцыі Брэст-Цэнтральны ў 13.00 і прыбываць у Цярэспаль у 12.20. У адваротным напрамку цягнік № 122 Цярэспаль — Брэст будзе адпраўляцца з Цярэспаля ў 13.51 і прыбываць на станцыю Брэст-Цэнтральны ў 15.12. (Па станцыі Брэст-Цэнтральны час паказаны беларускі, па станцыі Цярэспаль — польскі).

З 3 верасня паміж Брэстам і Цярэспалем аднаўлены рух усіх трох пар міжнародных цягнікоў: № 119/120, № 121/122 і № 123/124.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Ініцыятыва

# МАРАФОН ПРА БЕЛАРУСКУЮ ЛІТАРАТУРУ, «НЯМОЕ МАСТАЦТВА», ПТУШКА ГОДА...

## У сталіцы прайшоў першы гарадскі сацыяльны фестываль

**На пачатку верасня ў Мінску ўпершыню адбыўся гарадскі сацыяльны фестываль IBB JubiläumsFest. Ён аб'яднаў больш за 50 адукацыйных івэнтаў, якія прайшлі ў Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтры імя Ёханеса Рау (IBB Мінск). У гонар свайго 25-годдзя IBB Мінск на дзень падарыў свой будынак грамадскім актывістам і іх ініцыятывам.**



«Фестывалі могуць не толькі забаўляць, але і адукоўваць. Мы вырашылі правесці IBB JubiläumsFest, каб даць магчымасць беларускім грамадскім ініцыятывам сабрацца ў адным месцы і расказаць пра важныя праекты жыхарам Мінска. Сацыяльны маркет, вывучэнне мовы жэстаў, лекцыі і кінапаказы аб дыслексіі, правах жанчын і людзях з інваліднасцю — гэтыя і многія іншыя мерапрыемствы змогуць наведаць госці фестывалю IBB JubiläumsFest», — расказала **дырэктар IBB Мінск Сабрына БАБОЎСКІ.**

Мерапрыемствы сацыяльнага фестывалю, якія разгарнуліся на васьмі пляцоўках, мог наведаць усякі ахвотны. Так, пры жаданні можна было прайсці экспрэс-курс нямецкай мовы разам з Goethe-Institut Minsk. ПЭН-цэнтр зладзіў шматмоўны марафон пра беларускую літаратуру. Беларускае таварыства глухіх вучыла гасцей мове жэстаў і пазнаёміла з «нямым» мастацтвам.



Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа расказала пра тое, як аказваць першую медыцынскую дапамогу. Праект «Жывая бібліятэка» правёў гульню «Іншы погляд» на тэму сацыяльнай няроўнасці. А «Ахова птушак Бацькаўшчыны» абрала птушку 2020 года. Ёй стаў вялікі глушэц.

Таксама ў адукацыйным цэнтры прайшлі бясплатныя паказы беларускіх і нямецкіх фільмаў на сацыяльную тэматыку і літаратурныя чытанні. Ініцыятыва Minsk Impro правяла адкрыты майстар-клас па асновах імправізацыйнага тэатра. А Міжнародны тэатральны праект HomoCosmos паказаў спектакль «Камера, якую дала мне маці» (18+).

На фестывалі працаваў сацыяльны маркет, прадстаўлены беларускімі сацыяльнымі прадпрыемствамі. Рэстаран Westfalia на тэрасе IBB Мінск прапанаваў гасцям еўрапейскі стрыт-фуд і напоі. Спецыяльна ў гонар юбілею IBB Мінск пачаставаў усіх, хто прыйшоў на фэст, 25-кілаграмовым тортам.

А для самых маленькіх гасцей была арганізавана дзіцячая зона, дзе яны маглі паўдзельнічаць у арт-пленэры, майстар-класе па маляванні на вадзе і спячы печыва.

**Святлана БУСЬКО.**

ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ

# «ЖЫВІЦЕ ЗДОРАВА СА «ЗВЯЗДОЙ»!»





**I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

1. Рэкламная гульня пад назвай «Жывіце здорава са «Звяздой»!» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі ў тэрмін з 6 верасня да 31 снежня 2019 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2019 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — установа), месца знаходжання: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск, УНП 100155376.

**II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ**

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Жывіце здорава са «Звяздой»!» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда», — і складаецца з наступных рэчаў:

| № п/п | Назва | Колькасць (шт.) | Цана за шт. з ПДВ, руб. кап. | Усяго з ПДВ, руб. кап. |
|---|---|---|---|---|
| 1. | **Ровар Mikado Blitz Lite 26SHV.BLITZLT.18GR8 (шэры/зялёны), (далей — суперпрыз)** | 1 | 243, 54 | 243, 54 |
| 2. | **Фітнес-трэкер D&A M2 (белы) (далей — прыз)** | 7 | 51,60 | 361,20 |

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Жывіце здорава са «Звяздой»!» складае: — 604,74 (шэсцьсот чатыры рублі семдзесят чатыры капейкі).

**III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ**

4. Рэкламная гульня «Жывіце здорава са «Звяздой»!» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2019 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2019 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас установы ў перыяд з 6 верасня да 16 кастрычніка 2019 года выразаная з газеты або з дададковага ўкладыша запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце не менш чым раз на тыдзень у перыяд з 6 да 30 верасня 2019 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або тыя, якія паступілі ўстанове пасля 16 кастрычніка 2019 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

**IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ**

9. Для правядзення Гульні «Жывіце здорава са «Звяздой»!» установа стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — старшыня Камісіі;

члены Камісіі:

Чычко Аксана Мікалаеўна — начальнік упраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта»;

Доўнар Валянціна Аркадзеўна — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Корбут Віктар Эдуардавіч — загадчык адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

Юрына Алена Міхайлаўна — вядучы спецыяліст аддзела падпіскі і маркетынгу.

10. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

**V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ**

11. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 17 кастрычніка 2019 года ў 12 гадзін у памяшканні ўстановы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

12. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

13. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываюцца сем прызоў (па адным для кожнага).

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца, і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз.

14. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні, прадстаўнікоў незалежных арганізацый або члены Камісіі. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

15. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 27 кастрычніка 2019 года ўключна ў газеце «Звязда».

Установа ў тэрмін да 27 кастрычніка 2019 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

**VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ**

16. Умовай выдачы прызоў і суперпрыза з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2019 года.

Пры звароце па атрыманне прыза або суперпрыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза або суперпрыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2019 года.

17. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз або суперпрыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2019 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза або суперпрыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

18. Прызы і суперпрыз выдаюцца пераможцам у тэрмін да 31 снежня 2019 года ў памяшканні ўстановы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00 з панядзелка да суботы (выдачу ў суботу неабходна ўзгадніць з арганізатарам гульні па тэлефоне (017) 263 66 73, 287 17 40, для атрымання прапускных дакументаў). Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў па атрыманне прыза або суперпрыза, установа не аплачвае.

19. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

20. Пасля 31 снежня 2019 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

**VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

21. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

22. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны ўстановай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць установе.

23. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Жывіце здорава са «Звяздой»!» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваны сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

24. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефонах: (017) 263 66 73, 287 17 40.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3626 ад 27.08.2019 года выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
5 ВЕРАСНЯ 2019 г.
ЧАЦВЕР
№ 15 (15870)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Кацярына ДРОНАВА:

# «Я ў спорце з самага дзяцінства»



**Дынастыі ў любой прафесіі не рэдкасць, часта і ў спорце сустракаецца, што ў адной камандзе гуляюць браты або сёстры, ці дзеці ідуць па слядах спартыўных бацькоў, або на працягу кар'еры складваюцца спартыўныя саюзы. Прыклад сямейнай пераемнасці можна ўбачыць і сёння ў гандбольным клубе «Гомель». Ірыну і Кацярыну Дронавых лёгка прыняць за сясцёр, але на самай справе гэта мама і дачка. Ірына — лідар каманды, дасведчаная гандбалістка, на рахунку якой практычна сто матчаў за зборную Беларусі і 195 галоў за нацыянальную каманду. Кацярына — маладая, амбіцыйная і перспектыўная спартсменка. У 16 гадоў яна атрымала званне «Найлепшы абаронца Алімпійскіх дзён моладзі па гандболе», а ў 17 — выйшла на пляцоўку ў складзе асноўнай каманды «Гомеля».**

Ірына адзначае, што імкнецца быць прыкладам для дачкі і ў адным са сваіх інтэрв'ю кажа аб Каці так: «Я вельмі рада, што мы жывём з ёй агульнымі інтарэсамі і адной прафесіяй. Хоць Каця захварэла гандболам не адразу. Памятаю, калі яна была маленькая, я ў яе пыталася: «Пойдзеш займацца тым, у што мама гуляе?» А яна катэгарычна: «Не, не хачу!» Але ад лёсу не ўцячы. У школу прыйшла трэнер, спытала прозвішча. І, пачуўшы «Дронава», аслупянела: «Як?! І ты да гэтага часу не ў гандбольнай секцыі?»

Так у спорт прыйшла і Дронава-малодшая, менавіта яе мы і распыталі пра тое, што значыць гуляць на адной пляцоўцы з мамай і як бацька ставіцца да таго, што слабы пол у яго сям'і выбраў не самы жаночы від спорту.

***— Каця, успомніце, калі ласка, якім вы былі дзіцем, як праходзіла ваша маленства?***

— Я расла ў асяроддзі сваіх сваякоў і была, на мой погляд, досыць спакойнай дзяўчынай. З раніцы хадзіла ў школу, пасля заняткаў адпраўлялася на танцы. Мама на свае трэніроўкі мяне не брала, таму што ў мяне быў свой расклад, а вось на яе гульні хадзіць я вельмі любіла.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Не вучобай адзінай

# ТАКОЕ ЖАДАНАЕ ЛОЖКА-МЕСЦА

## Мара студэнта: атрымаць і не страціць



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Выгляд Студэнцкай вёскі з вышыні 17-га паверха.

**Што найперш хвалюе іншагародніх студэнтаў, калі тыя распачынаюць чарговы навучальны год? Правільна, жыллё. Цэны на сталічныя арэндныя кватэры і нават пакоі іншым часам «кусаюцца», таму не дзіўна, што многія хочуць пазбавіцца ад думак пра дадатковыя выдаткі. Найлепшым варыянтам, вядома, заўсёды з'яўляўся інтэрнат. Толькі як атрымаць там месца? Гэтае і шэраг іншых пытанняў узнікае ў былых абітурыентаў і іх бацькоў кожны год. Мы зазірнулі ў Студэнцкую вёску БДУ, каб убачыць на свае вочы, як прайшла падрыхтоўка да новага навучальнага года, а таксама пагутарылі з намеснікам дырэктара Студэнцкага гарадка БДУ па выхаваўчай рабоце Рыгорам ПАСРЭДНІКАМ.**

***— Колькі сёлета ахвотных атрымалі ў вас месцы?***

— Студэнцкая вёска БДУ — гэта дзесяць інтэрнатаў розных тыпаў пражывання. Больш за восем тысяч студэнтаў розных курсаў і формаў навучання ўжо маюць на руках ключы ад сваіх пакояў, з іх іншагародніх — каля 80 працэнтаў. Найбольшая колькасць выдзеленых месцаў у інтэрнатах № 7 і № 3 — іх больш за 1200, у №№ 2, 3, 4 і 10 — каля 700 у кожным, у астатніх — менш. Перш за ўсё пакоі атрымліваюць іншагароднія першакурснікі, сіроты, дзеці са шматдзетных сем'яў, студэнты, якія пражываюць у раёнах, пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

Выпрабавана на сабе

# ЗАЎСЁДЫ — ДОБРЫ НАСТРОЙ,

## ці Як я працавала аніматарам у санаторыі

**Некаторыя лічаць, што такая работа не патрабуе нейкай асаблівай падрыхтоўкі і наогул не ўяўляе з сябе нічога складанага. Многія нават не ведаюць, што гэта за прафесія і якія абавязкі ў яе ўваходзяць. Сёлета летам я вырашыла праверыць на сабе, ці сапраўды такі лёгкі названы занятак, як падаецца на першы погляд.**



Галоўнае — знайсці агульную мову з падапечнымі розных узростаў *(аўтар матэрыялу крайняя злева).*

Думка паехаць працаваць аніматарам абы важатай паўстала яшчэ ў сярэдзіне навучальнага года. Бліжэй да мая ў добраахвотніцкую арганізацыю «Слон» маёй ВНУ пачалі паступаць розныя прапановы. У выніку зацікавілася трыма варыянтамі падпрацоўкі на лета. У рэшце рэшт абрала вакансію аніматара ў санаторыі Віцебскай вобласці. Выбар гэтага месца работы быў у нейкім сэнсе выклікам самой сабе. Мне было цікава, ці змагу я цэлы месяц знаходзіцца ўдалечыні ад свайго дому без родных і сяброў, у незнаёмай абстаноўцы і сачыць за велізарнай колькасцю дзяцей.

Кастынгу ніякага не было, проста прыйшоў запыт ва ўніверсітэт, што патрабуюцца два аніматары. Аднак на ліпень, акрамя мяне, было яшчэ дзве прэтэндэнткі, якія хацелі паехаць у нейкі момант я ўжо вырашыла саступіць месца ім, але лёс распарадзіўся інакш. Адна дзяўчына не змагла паехаць, і ўсё вырашылася само сабой. Можна сказаць, што гэта стала для мяне яшчэ адным выпрабаваннем, таму што з маёй будучай напарніцай Настассяй Кудраўцавай мы былі ледзь знаёмыя, а нам трэба было разам жыць і працаваць цэлы месяц. Зараз удзячная лёсу, што паехала менавіта з ёй: мы вучымся ў паралельных групах, але я нават не ўяўляла да нашай паездкі, якая яна таленавітая, цікавы і добры чалавек.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)*

Вышэйшая школа

# СТАЦЬ СПЕЦЫЯЛІСТАМ... АНЛАЙН

## Дыстанцыйнае навучанне — даніна модзе ці будучыня?

**На працягу апошніх дваццаці гадоў сродкі навучання моцна эвалюцыянавалі. Сёння для таго, каб навучацца, зусім не абавязкова наведваць лекцыі. Тая ж інтэрнэт-акадэмія Хана дае бясплатны доступ больш чым да чатырох тысяч мікралекцый па самых розных дысцыплінах. Слухачамі вядомага праекта ў сферы масавай анлайн-адукацыі Coursera з'яўляюцца больш за 10 мільёнаў чалавек, якія вывучаюць каля 1000 курсаў ад больш чым 100 універсітэтаў. Сярод іх Стэнфард, Прынстан, Мічыганскі і Пенсільванскі ўніверсітэты.**

Ёсць меркаванне, што праз 10—15 гадоў анлайн-навучанне (як мінімум на ўзроўнях вышэйшай і дадатковай адукацыі) стане дамінаваць, а забяспечваць адукацыйны працэс ва ўмовах усеагульнай глабалізацыі будзе ўсяго некалькі сотняў (максімум — тысяч) універсітэтаў. Фактычна сёння ідзе барацьба за «месца пад сонцам». Хто праз дзясятак гадоў застанецца дзеючым гульцом на рынку адукацыйных паслуг, а хто будзе вымушаны саступіць сваё месца іншым?

**«Кантроль ведаў таксама праводзіцца дыстанцыйна: па відэасувязі або з дапамогай інтэрактыўных праграм тэсціравання».**

У Беларусі піянерам анлайн-навучання з'яўляецца Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі, дзе дыстанцыйныя адукацыйныя тэхналогіі развіваюцца з 2002 года.

— Калі ў 2008 годзе выпускнікамі дыстанцыйнай формы былі ўсяго шэсць чалавек, якія навучаліся па трох спецыяльнасцях, то праз дзесяць гадоў — ужо 70 чалавек, якія асвойвалі сем спецыяльнасцяў, — расказвае **дэкан факультэта інавацыйнай бесперапыннай адукацыі Яўген ШНЭЙДЗЕРАЎ.** — Наш факультэт быў утвораны ў 2017 годзе шляхам аб'яднання факультэта завочнага навучання і факультэта бесперапыннага і дыстанцыйнага навучання. У верасні таго ж года мы пераехалі ў новы навучальны корпус, у сувязі з чым у нас з'явіліся і новыя тэхнічныя магчымасці: у будынку пракладзены сучасныя камп'ютарныя сеткі, абсталяваны цэнтр відэаканферэнц-сувязі і цьютарскі бокс. Гэтыя новаўвядзенні дапамаглі зрабіць працэс атрымання ведаў больш эфектыўным. Мы адзіная ВНУ, якая ўключае ў план прыёму дыстанцыйную форму навучання. У гэтым навучальным годзе гэта было 170 месцаў. Цяпер на нашым факультэце па дыстанцыйнай форме атрымання адукацыі навучаецца амаль 500 студэнтаў. Такім чынам мы даём веды па найбольш запатрабаваных спецыяльнасцях IT-профілю: «аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі», «інжынерна-псіхалагічнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій», «інфарматыка і тэхналогіі праграмавання», «інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі (у бізнес-менеджменце), «праграмаваныя мабільныя сістэмы», «праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій», «эканоміка электроннага бізнесу» і «электронны маркетынг».

***— А чым дыстанцыйная форма навучання адрозніваецца, напрыклад, ад завочнай?***

— Выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій: студэнт працуе хоць і самастойна, але пры пастаянным узаемадзеянні з выкладчыкам. Абмен інфармацыяй паміж імі адбываецца з дапамогай інтэрнэту і анлайн-сэрвісаў. Студэнт можа атрымаць кансультацыю, неабходную літаратуру і праслухаць лекцыі аддалена. Кантроль ведаў таксама праводзіцца дыстанцыйна: па відэасувязі або з дапамогай інтэрактыўных праграм тэсціравання. Не трэба чакаць выкладчыка па раскладзе — можна задаць яму пытанне праз інтэрнэт, атрымаць аператыўны адказ і далей працаваць самастойна.



Гэта дазваляе дынамічна і паспяхова асвойваць прадметы з тым тэмпам, які зручны студэнту, а таксама з улікам яго індывідуальных асаблівасцяў і абставін. У працэсе навучання існуе магчымасць скласці індывідуальны графік вывучэння дысцыплін у рамках бягучага семестра, чаго пры завочнай форме навучання зрабіць нельга. У студэнтаў дыстанцыйнай формы практычна адсутнічаюць абавязковыя заняткі ў ВНУ, прыязджаць трэба толькі на здачу залікаў і экзаменаў.

***— Ці можаце вы скласці партрэт вашага студэнта?***

— Дыстанцыйнае навучанне часта выбіраюць тыя, хто хоча атрымаць якасную вышэйшую адукацыю без адрыву ад работы, другую вышэйшую адукацыю паралельна з першай, і людзі, якім з прычыны іх фізічных асаблівасцяў цяжка перамяшчацца па горадзе. Сярод нашых студэнтаў паспяхова навучаюцца 12 чалавек з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі. З дазволу Міністэрства адукацыі яны і атэстацыю могуць праходзіць дыстанцыйна. За апошнія чатыры гады вышэйшую адукацыю ў БДУІР на дыстанцыйнай форме атрымалі дзевяць чалавек з абмежаванымі магчымасцямі. Дыягназы ў іх розныя, пераважна гэта парушэнні апорна-рухальнага апарата. Сёлета на другі і старэйшыя курсы для атрымання другой вышэйшай адукацыі былі залічаны 34 чалавекі. Пачынаючы з 2004 года, на факультэт інавацыйнай бесперапыннай адукацыі прыходзяць студэнты, якія паралельна жадаюць атрымаць другую спецыяльнасць, хоць іх і няшмат, бо вучыцца адразу па некалькіх спецыяльнасцях складана.

**«Акалічнасць, якую абавязкова трэба мець на ўвазе, — для адукацыі на адлегласці патрабуецца самадысцыпліна».**

Акрамя таго, камп'ютар і інтэрнэт прыходзяць на дапамогу студэнтам, якія хочуць вывучаць у індывідуальным парадку асобныя дысцыпліны. На працягу месяца пасля пачатку вучобы студэнт дзённай формы навучання можа напісаць заяву аб тым, што ў яго ёсць жаданне тую ці іншую дысцыпліну вывучаць дыстанцыйна. Ці, напрыклад, студэнт плануе перавесціся з адной спецыяльнасці на іншую. Як вывучыць той прадмет, які трэба здаць дадаткова? Адказ відавочны — асвоіць яго дыстанцыйна.

***— А як анлайн-навучанне рэалізуецца на практыцы?***

— З 2017 года мы перайшлі на выкарыстанне электронных адукацыйных рэсурсаў новага пакалення. Увесь тэарэтычны матэрыял разбіты на модулі. Кожны модуль змяшчае як мінімум адну мультымедыйную ўстаўку: відэалекцыю, прэзентацыю, вучэбны фільм. Пасля яго засваення прадугледжаны прамежкавы кантрольны тэст. Студэнты асвойваюць модулі пакрокава, доступ да наступнага атрымліваюць толькі пасля праходжання папярэдняга, гэта значыць, пасля вывучэння тэарэтычнага матэрыялу, відэакантэнту і паспяховага праходжання тэсту, а допуск да бягучай атэстацыі — пасля праходжання ўсіх модуляў. Такі пакрокавы сцэнарый засваення вучэбнай дысцыпліны дазваляе матываваць студэнтаў і павышаць якасць усяго адукацыйнага працэсу. А электронныя рэсурсы новага пакалення арганізоўваюць сеткавае навучанне, аўтаматызуюць прамежкавы і выніковы кантроль.

Фармат дыстанцыйнага навучання адпавядае сучасным сусветным тэндэнцыям. Пастаянна абнаўляецца кантэнт: лекцыі, індывідуальныя практычныя работы, кантрольныя работы, тэсты. Нашым студэнтам дадзены самыя шырокія магчымасці навучання з прымяненнем сучасных электронных сістэм, выкарыстання больш як 400 якасных электронных адукацыйных рэсурсаў па розных дысцыплінах.

На факультэце інавацыйнай бесперапыннай адукацыі чалавек атрымлівае паўнавартасную вышэйшую адукацыю, комплексныя веды і дыплом дзяржаўнага ўзору з прысваеннем адпаведнай кваліфікацыі. Тэрмін навучання складае пяць гадоў і тры гады — пры атрыманні другой вышэйшай адукацыі.

**«Цяпер на нашым факультэце па дыстанцыйнай форме атрымання адукацыі навучаецца амаль 500 студэнтаў».**

***— Няўжо дыстанцыйнае навучанне можа цалкам выцесніць з вышэйшай школы прафесара з кафедры? Магчымасць атрымаць вышэйшую адукацыю дома, не ўстаючы з-за камп'ютара, выглядае, канешне, прыцягальна, але ў дыстанцыйнай формы ёсць не толькі плюсы, але і мінусы...***

— Да іх я аднёс бы дэфіцыт асабістых стасункаў: у вас не атрымаецца павесяліцца з аднагрупнікамі на пары, схадзіць разам у сталоўку. Калі вы любіце камунікаваць і ўжо ўяўляеце сабе студэнцкія тусоўкі, інтэрнэт-адукацыя вам наўрад ці спадабаецца. Яшчэ адна акалічнасць, якую абавязкова трэба мець на ўвазе, — для адукацыі на адлегласці патрабуецца самадысцыпліна. Трэба самастойна змагацца з лянотай, развіваць усседлівасць і самакантроль, каб своечасова прайсці тэорыю і атэстацыю. Дыстанцыйна немагчыма вывучыцца, напрыклад, на ўрача ці на пілота, але атрымаць прафесію ў IT цалкам магчыма.

З «базай» у галаве

# Нестандартная матэматыка

**Прадстаўнікі БДУ і БДУІР у складзе нацыянальнай зборнай увайшлі ў топ-20 найлепшых удзельнікаў каманднага заліку на 26-й Міжнароднай студэнцкай алімпіядзе па матэматыцы. International Mathematics Competition (IMC) — адзін з самых прадстаўнічых міжнародных спаборніцтваў сярод студэнтаў.**

На рахунку ў беларускай каманды два залатыя, сярэбраны і бронзавы медалі. «Золата» зборнай прынеслі трэцякурснік факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ Ягор Дубовік і студэнт другога курса факультэта камп'ютарных сітэм і сетак БДУІР Яўген Мінаў. «Серабро» заваяваў магістрант хімічнага факультэта БДУ Андрэй Сямёнаў. «Бронзу» — першакурснік факультэта камп'ютарных сістэм і сетак БДУІР Яўген Баяк.

Усяго сёлета ўдзельнікамі алімпіяды сталі 360 студэнтаў са 120 ВНУ, якія прадстаўлялі 52 краіны Еўропы, Азіі, Афрыкі, Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі. Маладым матэматыкам у рамках двух тураў прапаноўвалася на англійскай мове рашаць дзесяць задач. Іх тэматыка аб'ядннала розныя кірункі: тэорыю лічбаў, камбінаторыку, лінейную алгебру і матэматычны аналіз. Кожны тур доўжыўся пяць гадзін.

Міжнародная алімпіяда — гэта арыгінальныя задачы, у якіх трэба разважаць і прапаноўваць падыходы, не апісаныя ў падручніках. Як канстатуюць нашы пераможцы, па ўмове задачы не заўсёды магчыма вызначыць яе складанасць: рашэнне можна запісаць у два радкі, а можна не ўціснуць і на аркуш. Выдатнае выступленне — гэта рашыць столькі заданняў, колькі дазваляе твой узровень ведаў, не згубіць балы на памылках і не заблытацца ў тым, што ты ведаеш.

Ведай нашых!

# Не проста шахматы

**Першакурснік факультэта камп'ютарных сістэм і сетак БДУІР Антон СТАРЫКЕВІЧ стаў віцэ-чэмпіёнам свету па сёгі. Пра гэта паведаміла прэс-служба ўніверсітэта.**

Сёгі (або японскія шахматы) — культавая гульня, якая атрымала распаўсюджванне далёка за межамі Краіны Узыходзячага Сонца. Яна падобная на традыцыйныя, але мае свае адметнасці. Галоўнае — калі ў шахматах збітая фігура пакідае поле, то ў сёгі, забраўшы яе ў праціўніка, можна ёю скарыстацца. Ёсць фігуры, якія нагадваюць шахматныя, але ёсць і такія, што не сустрэнеш у традыцыйнай гульні.

Чэмпіянат свету па сёгі праходзіў у Браціславе (Славакія). Антон абышоў больш за сто ўдзельнікаў з Японіі, ЗША, Францыі, Вялікабрытаніі, Германіі, Расіі і іншых краін.

Дарэчы, сёлета Антон Старыкевіч стаў пераможцам маладзёжнага чэмпіянату Еўропы па сёгі. Зборная Беларусі, капітанам якой ён з'яўляецца, выйграла найбуйнейшы ў свеце анлайн-турнір World Shogi League. У фінале нашы перамаглі расійскую каманду.

Дарэчы, наступныя чэмпіянаты Еўропы і свету будуць праходзіць менавіта ў Мінску, і Антон ускладае на гэтыя турніры вялікія спадзяванні.

**Матэрыялы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

І сабе, і людзям

# ГУЛЬНІ ПРАЙШЛІ, А ДОСВЕД ЗАСТАЎСЯ



## Што стала галоўным здабыткам для валанцёраў

**II Еўрапейскія гульні, якія сустракаў Мінск у чэрвені, не маглі абысціся апроч спартсменаў без вялікай каманды тых, што таксама на працягу двух гадоў рыхтаваўся да іх. Гаворка ідзе пра валанцёраў. Яны ўдзельнічалі ва ўсіх этапах спартыўных спаборніцтваў, стваралі асаблівую атмасферу свята, усім дапамагалі і ўсіх падтрымлівалі. Мы пагутарылі з тымі, хто ў перыяд правядзення гульняў быў часткай адной вялікай каманды такіх добраахвотнікаў. Страсці ўлегліся, а што засталося ў памяці?**

**Маргарыта ГАРМАЗА, магістрантка факультэта журналістыкі БДУ,** працавала на пазіцыі «Асістэнт НАК», а таксама з'яўлялася лідарам у сваёй камандзе валанцёраў.



— Да II Еўрапейскіх гульняў я ўжо спрабавала свае сілы ў якасці валанцёра на чэмпіянатах Еўропы па фігурным катанні і біятлоне, на міжнародным турніры па сквошы. Гэтым жа разам маім абавязкам было ўзаемадзеянне з камандай спартсменаў з Азербайджана і іншымі валанцёрамі. Баку прымаў першыя Еўрапейскія гульні, таму складанасцяў з разуменнем адзін аднаго, арганізацыйнымі момантамі амаль не было. Калі ў кагосьці ўзнікала пытанне ў гадзіну ночы ці а пятай раніцы, праблему хутка вырашалі.

Маргарыта дзеліцца, што самым крутым набыткам падчас падрыхтоўкі была магчымасць хадзіць на розныя трэнінгі, карысныя сустрэчы і практыкавацца ў англійскай мове. А таксама шалёны рытм падчас саміх гульняў, без якога дзяўчына ўжо не можа ўявіць сваё жыццё.

— Асаблівасць валанцёрства ў тым, што тут няма паняцця «кожны сам па сабе», ёсць цэласнасць, падтрымка. Нават пасля закрыцця II Еўрапейскіх гульняў многія з нас сустракаюцца, дзеляцца сумеснымі фатаграфіямі ў сацсетках, гавораць прыемныя словы, — кажа суразмоўніца.

**Студэнтка чацвёртага курса педагагічнага ўніверсітэта Віялета АЛЯШКЕВІЧ** працавала на



пазіцыі «Кейтэрынг». Гэты кірунак прадугледжвае арганізацыю харчавання для ўдзельнікаў гульняў. Дзяўчына кажа, што падчас работы больш чым на пяць хвілін на адным месцы не затрымлівалася, кожны дзень праходзіла каля 15 кіламетраў! За стараннасць Віялета была ўзнагароджана граматай Міністэрства спорту і турызму «За значны асабісты ўклад у падрыхтоўку і правядзенне II Еўрапейскіх гульняў 2019 года ў горадзе Мінску».

— Я была лідарам у камандзе з 20 чалавек. Работа патрабавала адказнасці, і я імкнулася нікога не падвесці. Калі II Еўрапейскія гульні скончыліся, зноў адразу хацелася заняць сябе чымсьці актыўным. І я паехала ў дзіцячы лагер у якасці важатай. Пасля атрыманага вопыту на такім маштабным мерапрыемстве няўпэўненасць у сабе і страх зрабіць штосьці не так «як трэба» зніклі. Дарэчы, з камандай, з якой я працавала, дагэтуль падтрымліваем сувязь. Нават у розныя гарады ездзім адно да аднаго, — падзялілася Віялета.

Матывацыя на работу ў валанцёраў у перыяд II Еўрапейскіх гульняў была розная. Хтосьці пайшоў дзеля яркіх эмоцый, хтосьці — каб заняць сябе актыўнай справай, а некаторыя — з-за вялікай цікавасці да спорту. **Багдан МАРЫНІН, студэнт трэцяга курса БДАТУ** з іх ліку. Хлопец хацеў наведаць амаль усе спаборніцтвы. І ў яго гэта атрымалася! Ён таксама расказаў, што за добрую работу і дапамогу не раз атрымліваў падзякі ад гасцей свята:



— Такі вопыт валанцёрства ў мяне ўпершыню, але страху не адчуваў. Быў выпадак, калі давялося шукаць адну вёску, а затым білеты туды для сям'і з... Кітая. Аказалася, што пасля Другой сусветнай вайны іх дзядуля застаўся ў ёй жыць. Неверагодная гісторыя. Праўда? Чаму б не дапамагчы? Падобных сітуацый было шмат. За нашу стараннасць турысты дарылі шакалад, цукеркі — гэта было прыемна.

**Вольга ПРЫСТУПА, студэнтка чацвёртага курса філалагічнага факультэта БДУ** з кірункам работы на II Еўрапейскіх гульнях вызначылася хутка — «Спартыўны валанцёр».



— Уражанні ад работы ў камандзе валанцёраў самыя лепшыя. Я была адным з цім-лідараў — каардынатараў групы сваёй пазіцыі. Мне трэба было ведаць правілы і прынцыпы тых відаў спорту, з якімі мы сутыкаліся. Інтэнсіўнае навучанне да Гульняў пачалося задоўга да іх адкрыцця. Кожны дзень мы атрымлівалі заданні рознага фармату: відэаўрокі, тэсты, трэнінгі і майстар-класы. Больш за ўсё мне спадабалася тэставае мерапрыемства — кантынентальны кубак European Judo Open. На той момант гэта былі першыя маштабныя спартыўныя спаборніцтвы ў маім жыцці. Акрамя таго, у валанцёрскім цэнтры кожны дзень праходзілі квэсты, вікторыны, конкурсы і квізы. Можна было затрымацца пасля змены і весела правесці свой час. Тым больш што сесію валанцёры «закрывалі» датэрмінова.

Дзяўчына дзеліцца, што рабочы дзень доўжыўся пяць-сем гадзін, бывала і больш, але час ішоў хутка. Пачуцця стомленасці не было, наадварот, выконвала пастаўленыя задачы суразмоўніца з задавальненнем:

— Усяго за два тыдні мы з іншымі валанцёрамі паспелі стаць сябрамі. Ва ўсіх былі энтузіязм у вачах і жаданне аддавацца рабоце на сто працэнтаў. Дарэчы, з некаторымі сустракаемся дагэтуль, прыемна чуць, з якой цеплынёй яны ўспамінаюць час, праведзены разам. Госці з замежжа таксама дзякавалі за нашу работу, нават па-беларуску!

Вольга па выніках работы таксама была ўзнагароджана граматай Міністэрства спорту і турызму.

Цікава, якую работу даверылі валанцёрам кірунку «Медыцынскае абслугоўванне»? **Дарына БОНДАР, студэнтка чацвёртага курса БДМУ,** расказала, што абавязкаў было нямала, але пазітыўных эмоцый — яшчэ больш:



— Адразу ведала, з чым магчыма прыйдзецца сутыкнуцца, бо работа звязана з будучай прафесіяй. Я была лідарам у камандзе з 45 чалавек, страх прысутнічаў толькі спачатку, далей не мела часу нават думаць пра гэта. Мы былі адказныя за прэпараты, інструменты, сачылі за тым, у якім фізічным стане знаходзяцца госці свята. Аказваць медыцынскую дапамогу без дазволу ўрача забаранялася, бо ў нас яшчэ няма патрэбнай кваліфікацыі. Лічу, што, прайшоўшы праз усё гэта, я стала зусім іншым чалавекам!

Для **студэнта другога курса Аляксандра БАГАТКІ,** які вучыцца




ца на факультэце радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій БДУ, вопыт валанцёрства — даўно знаёмая і любімая справа. Ёй пачаў займацца яшчэ ў школе, а зараз хлопец з'яўляецца каардынатарам добраахвотнікаў ва ўніверсітэце. Яшчэ да пачатку свята Аляксандр наведаў шмат тэставых мерапрыемстваў: самба, бокс, гімнастыка, еўрапейскі чэмпіянат па фігурным катанні ISU-2019, а таксама дыпламатычныя брыфінгі. Дзякуючы адданасці, энтузіязму і шчырай цікавасці да работы хлопец стаў першым валанцёрам у гісторыі, які на закрыцці II Еўрапейскіх гульняў уручаў медалі ад Міжнароднага алімпійскага камітэта. Звычайна гэта робяць прэзідэнты нацыянальных алімпійскіх камітэтаў і генеральныя сакратары:

— Я быў заўсёды гатовы дапамагчы, застаючыся прыязным і тактоўным да ўсіх гасцей, персанала і іншых валанцёраў. Шчыра кажучы, трохі нерваваўся, таму што гэта — першы раз у гісторыі Гульняў. Яны сталі выдатным вопытам, бо ўсё было добра арганізавана ў месцах правядзення матчаў, і ўсе замежнікі, з якімі я размаўляў, былі таксама вельмі шчаслівыя. Пратакол — мой кірунак на II Еўрапейскіх гульнях. Я быў адказны за міжкультурныя і міжнацыянальныя стасункі. Ужо падчас работы на стадыёне «Дынама» зразумеў, што рашэнні давядзецца прымаць хутка — гэта матывавала станавіцца лепшым! На гульнях я сустрэў людзей розных прафесій: юрыст, фатограф, мастак, журналіст, і гэта было крута, бо ў паўсядзённым жыцці бывае цяжка завесці размову з незнаёмымі, але цікавымі асобамі.

**Дар'я ДРЭВІЛА — студэнтка трэцяга курса машынабудаўнічага факультэта БНТУ.** Кірунак



для работы ў якасці валанцёра на II Еўрапейскіх гульнях выбірала нядоўга. «Допінг-кантроль» — так гучыць пазіцыя, што прадугледжвае суправаджэнне спартсменаў на гэтую працэдуру, а таксама падтрыманне парадку на аб'ектах. У Дар'і іх было тры: Палац спорту, Вяслярны канал і Палова-арэна.

— За перыяд правядзеня II Еўрапейскіх гульняў мне пашчасціла наведаць шмат спаборніцтваў. З некаторымі спартсменамі, якіх я суправаджала на допінг-кантроль, былі цікавыя размовы. Галоўнай матывацыяй на такі вопыт для мяне стала англійская мова. Мне падабаецца яе вывучаць, але практыкі звычайна мала. Таксама я люблю спорт, кожны год імкнуся ўдзельнічаць у спартыўных мерапрыемствах у якасці валанцёра — так папаўняю веды па асобным відзе спорту і атрымліваю безліч станоўчых эмоцый. Я — актыўны чалавек, таму і далей буду працягваць займацца валанцёрствам. Часам чую, што калі пачнеш — цяжка спыніцца. І гэта праўда!

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

ЧЫРВОНКА. ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
5 09 2019 г.

*Нябачныя масты*

# Калі імя вам — першакурснікі...

## Парады бывалых наконт знаёмстваў з аднагрупнікамі

**Ну што, вось і здзейснілася тое, чаго вы так доўга чакалі, мае даражэнькія адзінаццацікласнікі. Ой, прабачце, першакурснікі! Нарэшце пасля стольких намаганняў дзверы ВНУ адчыніліся і для вас. Цяпер можна смела рыхтавацца да шматлікіх змяненняў: новых ведаў, новага спосабу жыцця (я пра бяссонныя студэнцкія ночы перад экзаменам, калі што), новых сяброў. Добра-добра, пра вучобу далей не буду расказваць, самі з цягам часу даведаецеся што да чаго. Мне здаецца, вам больш цікава і карысна на гэтым этапе будзе паслухаць, як лепш выбудоўваць стасункі з аднакурснікамі. Вось некалькі лайфхакаў для «першакоў»...**



Нішто так не зближае, як сумесныя вечарыны пад гарбату...



...і разам накрыты стол са студэнцкімі прысмакамі.

Першы пункт цалкам залежыць ад куратараў. Гаворка пра старшакурснікаў, якія будуць суправаджаць вас першы семестр, адказваць на пытанні і дапамагаць вырашаць праблемы. Маёй групе вельмі пашчасціла з імі. Хлопцы знайшлі кожнага ў сацыяльных сетках, стварылі агульны дыялог, і там мы дамовіліся, што сустрэнемся ў вольны час: зробім пікнік з торцікам, гітарай і гульнёй «Уна». Так усе пазнаёміліся, павесяліліся і правялі апошні дзень лета.

Пікнік на прыродзе — гэта, канешне, класна, але ў сценах альма-матар адчуваеш сябе зусім па-іншаму. Шмат людзей, усе ўсіх ведаюць (так можа падацца на першы погляд), смяюцца... А вы стаіце ў адзіноце, «падпіраеце» сцяну і адчуваеце няёмкасць... Але не хвалюйцеся, магу вас абрадаваць — першыя два тыдні вы будзеце ўсёй групай шукаць патрэбную аўдыторыю. Адным словам, сляпыя кацяняты. І, паверце, такія пошукі рэальна зближаюць! Будзе і гучны смех на ўвесь калідор, і шмат жартаў, і бясконцыя спазненні. Але ж у вас ёсць жалезнае алібі: вы — першакурснік. Зрэшты, я не заклікаю кожнае спазненне апраўдваць менавіта гэтым. Майце сумленне!

Наступны пункт звязаны з прыемным. Размова пойдзе пра ежу. Усе чулі фразу: "Заўсёды галодны студэнт". Дык вось, гэта чыстая праўда! Але ж голад больш знаёмы тым, хто вучыцца ў чужым горадзе і каго матуля не чакае з боршчыкам, пакуль вы вяртаецеся з пар. Так што прапанаваная гарбата з вафелькай ці булачкай могуць падняць настрой вашаму патэнцыяльнаму сябру. Я, напрыклад, па першым часе цягала «ссабойкі». Тэрмас са смачнай кавай і кантэйнер з буцікамі, якія мне раніцай рыхтавала матуля, адразу збіралі побач амаль усю групу! А што, мне не шкада, ешце на здароўе.

З папярэдняга пункта выцякае яшчэ адзін. Памятайце, у ВНУ працуе закон узаемадапамогі, а не «кожны сам за сябе». Так, гэта крута, калі ты можаш разлічваць на кагосьці ці сам выручыць таварыша. Даць ручку, калі ў аднагрупніка ў ёй раптам скончыўся стрыжань, ці апоўначы друкаваць рэферат, бо сябра зусім забыўся пра яго, а заўтра з ім трэба да першай пары, ці проста пазычыць грошы на білет дадому.

Ёсць яшчэ такі пункт. Як цудоўна, калі вы будзеце рабіць сюрпрызы на дзень нараджэння аднагрупнікаў: торт, свечкі, падарункі... Галоўнае, каб усё было ад шчырага сэрца. Можна зрабіць адмысловы каляндар з такімі датамі ў жыцці ўсіх членаў групы, тады вы на 100 працэнтаў не забудзецеся пра свята ў кожнага!

Не лічыце, што толькі на вашы кволыя плечы звалілася цяжкая ноша знаёмства з іншымі студэнтамі. Універсітэт таксама спраўна ўносіць сваю лепту ў гэтую справу. Існуе шмат свят, да якіх трэба рыхтавацца вялікім гуртам. Адно з іх — дзень першакурсніка. Вось тады ў вас і будзе магчымасць паказаць не толькі сваім аднагрупнікам, але і ўсяму патоку, старэйшым студэнтам і выкладчыкам, якія вы таленавіты і рознабаковы. І паверце, перамога ў такіх конкурсах — не самае галоўнае. Доўгія рэпетыцыі ў калідорах да пасінення, усё новыя і новыя ідэі і рашэнні для сцэнарыя, пірог, што прынесла твая аднагрупніца, якая рабіла яго на старэнькай пліце ў інтэрнаце... Гэтыя цёплыя, нібы коўдра, успаміны будуць доўгі час грэць ваша сэрца.

Шмат чаго для вас зробяць і выкладчыкі. Некаторыя на парах праводзяць гульні для знаёмства. Адна з педагогаў такім чынам гуляла з намі: пакуль гарэла запалка, трэба было расказаць пра сябе як мага больш. Вельмі забаўна было чуць, як некаторыя тараторылі і маглі выдаць не толькі сваю біяграфію, але бацькоў і дзядоў. У групы ёсць яшчэ класны кіраўнік (кажучы па-школьнаму). У студэнтаў гэтая важная для першакурснікаў асоба завецца куратарам. Нашы куратарскія гадзіны праходзілі на кафедры. З гарбатай, пернікамі, аповедамі пра сябе.

Знаёмствы, як вядома, адбываюцца не толькі ў сценах універа. У інтэрнаце таксама ёсць шмат перадумоў да гэтага. Найперш, суседства. Разам у пакоі можа жыць не толькі ваш аднагрупнік, але і студэнт з патоку ці нават са старэйшага курса. Паколькі сама я з Мінска, то пра такія першыя сустрэчы ў блоку інтэрната мне расказалі іншагародні аднагрупніцы. «У гэтым няма нічога страшнага. Ці да цябе заходзяць у пакой і знаёмяцца, ці, наадварот, ты так робіш, — падзялілася Ліза Танана. «А я сабрала адразу ўсіх. Хоць разумею, што чалавек я складаны, а жыць са мной — яшчэ складаней», — прыгадала Эліна Сівак. Стасункі будуюцца не толькі пры дапамозе быту. У пакоі можна ладзіць вечарыны з гітарай, песнямі і гульнямі. І ўвогуле,назіраючы за «Інстаграмамі» маіх аднагрупнікаў, магу сказаць: жыць у інтэрнаце весела.

А вось яшчэ некалькі «нелегальных» спосабаў адшукаць сваіх аднадумцаў.

Сярэдняя колькасць заняткаў у ВНУ — чатыры пары. Чатыры пары — гэта восем урокаў у школе. Па першым часе выседзець іх вельмі цяжка. Але ж можна... скараціць колькасць пар. Менавіта такі прагул (і не абы-якой лекцыі, а выніковага дыктанта) дапамог мне знайсці сяброўку. Хавацца пад лесвіцай ва ўніверы, а потым імкнуцца не трапіць на вочы выкладчыку, з пары якога вы збеглі, — гэта вельмі зближае. Я, канешне, не раю вам злоўжываць такім крокам, так можна рабіць у выключных выпадках. Ну, калі вельмі-вельмі хочацца...

Яшчэ мне здаецца, што няма такога студэнта, які б не карыстаўся галоўнай зброяй супраць нездавальняючых адзнак. Так, размова пра спісванні дамашніх заданняў. Вы не думайце, што мы такія гультаі. Гэта ўсё надвор'е! Птушкі спяваюць, душа радуецца... А потым бац — і ў цябе мільён «хвастоў»! Яшчэ здзіўляешся: адкуль яны маглі павылазіць?! Так што сумеснае спісванне «дамашкі» за дзесяць хвілін да пачатку пары не толькі аб'ядноўвае, але і робіць добры рэйтынг усёй групе. І вы малайцы, і выкладчыку прыемна. Толькі т-с-с-с, я вам гэтага не казала!

Дарагія сябры, зразумейце, што ўсе вы, першакурснікі, у аднолькавых умовах, і ўсім вам крыху страшнавата. Нічога не бойцеся, галоўнае — будзьце сабою!

**Кацярына ЯРАШЭВІЧ,**
**студэнтка II курса факультэта журналістыкі БДУ.**

# ТАКОЕ ЖАДАНАЕ ЛОЖКА-МЕСЦА

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

***— Што было зроблена сёлета перад тым, як сюды заехалі новыя пасяльцы?***

— Кожнае лета ў нас функцыянуе студэнцкі атрад па добраўпарадкаванні інтэрнатаў. Сёлета на працягу чэрвеня і ліпеня 180 чалавек — па 20—30 на адзін інтэрнат — наводзілі парадак у памяшканнях да новага навучальнага года. Фарбавалі сцены, батарэі, рамантавалі і ўстанаўлівалі мэблю, выконвалі іншыя дробныя работы. Інтэрнаты № 4 і № 11 былі задзейнічаны ў II Еўрапейскіх гульнях, да іх там быў зроблены касметычны рамонт. Да таго ж у гэтым годзе пачався капітальны рамонт у інтэрнаце № 6 — замена вокнаў у блоках і абнаўленне фасада. Складзены праект на такі ж рамонт у інтэрнаце № 10 — там з'явіцца новы цеплавузел, таксама заменяць вокны, уцепляць фасад і абновяць дах. Такія работы праводзяцца без адсялення студэнтаў з пакояў.

***— Што прапануецца насельнікам для баўлення вольнага часу?***

— Інтэрнат — другі дом для студэнта, а для некага і першы. Тут яны праводзяць большую частку свайго дня, таму зразумела, што без арганізацыі розных заняткаў па інтарэсах не абысціся. У кожным інтэрнаце ёсць пакоі адпачынку, самакіравання, самападрыхтоўкі. Акрамя таго, трэнажорныя і чытальныя залы, спартзала. Актыўна развіваецца студэнцкае самакіраванне — тыя, хто адчуваюць патрэбу ў рэалізацыі творчых і кіраўніцкіх здольнасцяў, могуць далучыцца, прымаюцца ўсе ахвотныя. Для таго каб зрабіць добрыя ўмовы для пражывання студэнтаў з абмежаванымі магчымасцямі, у інтэрнатах №№ 2, 3, 4 і 11, устаноўлены пандусы і ліфты-пад'ёмнікі.

***— Ці можна «заслужыць» месцы ў інтэрнаце?***

— У першую чаргу яны даюцца льготнікам. Калі вы не ўваходзіце ў іх лік, атрымаць месца таксама можна, для гэтага трэба папрацаваць у студатрадзе або быць часткай будатрада інтэрнатаў — ахвотных, дарэчы, хапае. Мы не бяром студэнтаў-старшакурснікаў з запазычанасцямі па вучобе, бо лічым, што навучанне ва ўніверсітэце павінна быць на першым месцы.



...і не менш утульныя пакоі там жа.



Зручныя кухні ў інтэрнаце № 4...

***— А чаго рабіць не трэба, каб не страціць атрыманае?***

— Інтэрнат — гэта месца, дзе у кожнага ёсць свае інтарэсы і асабістыя межы, якія трэба паважаць. Тут забаронена курыць, ужываць спіртныя напоі, парушаць нормы цішыні і санітарныя нормы. Пакаранне за парушэнне бывае рознае: можна атрымаць папярэджанне, а можна — вымову са скасаваннем дамовы. Гэта значыць, што на наступны навучальны год верагоднасці, што залічаць у інтэрнат нават пры наяўнасці льготаў або добрых паказчыкаў па вучобе, няма.

***— Нагадайце пра аплату пражывання...***

— Яна залежыць ад тыпу інтэрната. За пражыванне ў пакоі кватэрнага тыпу — 1,2 базавай велічыні, блочнага — 0,8, калідорнага — 0,4. У студэнтаў-бюджэтнікаў гэтая сума можа адымацца ад стыпендыі па іх пісьмовых заявах. Тым, хто вучыцца на платнай аснове, і тым, хто страціў права на атрыманне стыпендыі, да 25-га чысла кожнага месяца трэба ўнесці аплату ў любым банку, інфакіёску, банкамаце ці праз інтэрнэт-банкінг па нумары студэнцкага білета.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**



*Паставім эксперымент*

# ДЗІВОСНАЕ — ЗА НЕКАЛЬКІ КРОКАЎ

## Гэта заўважаюць юныя дапытлівыя розумы

**У сталіцы на VII Міжнародным турніры юных даследчыкаў прыроды «IYNT» (International Young Naturalists' Tournament) упершыню сустрэліся падлеткі з 11 краін: Беларусі, Балгарыі, Грэцыі, Казахстана, Новай Зеландыі, Харватыі, Кітая... Хлопчыкі і дзяўчаткі ад 12 да 16 гадоў спаборнічалі ў інтэлектуальных паядынках на працягу чатырох дзён. Адметны знак гэтага свята — англійская мова, якая была асноўным сродкам стасункаў паміж удзельнікамі і арганізатарамі мерапрыемства. Месцам сустрэчы для юных знаўцаў стаў Ліцэй БДУ. Што цікавага адбывалася на турніры?**



...Атмасфера ў зале неймаверная, тут вельмі шумна і шмат усмешак! Капітан беларускай каманды, пятнаццацігадовая Дар'я СІНІЦА, упэўненая, што гэта не дзіўна, бо ўсе аб'ядналіся дзеля агульнай мэты — навукі:

— Я ніколі раней не ўдзельнічала ў падобным. Адметна, што мы паказваем і даказваем: хімія, фізіка, біялогія — свет дзівосных адкрыццяў. Падчас турніру рашалі шмат цікавых задач. Напрыклад, што ўяўляе сабой кароткатэрміновая памяць і як кафеін уздзейнічае на яе, чаму курыная костка пад уздзеяннем кіслаты становіцца гнуткай, як розныя кампаненты хлеба ўплываюць на аб'ём гатовага прадукту. Мы перамаглі ў капітанскім баі сярод камандаў з Грэцыі і Грузіі, у паядынку з Казахстанам і Балгарыяй. Для выхаду ў паўфінал не хапіла паўтара бала. Гэта, вядома, трохі крыўдна, але разам з тым мы набылі велізарны вопыт, карысныя кантакты і сяброў. Усё ж такі агульныя спаборніцтвы збліжаюць, — з усмешкай кажа Дар'я.

Суразмоўніца падзялілася, што падрыхтоўка да турніру была напружаная, але ліцэістам БДУ дапамагалі кіраўнікі — трэцякурсніца факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій БДУ Соф'я АНІСІМАВА і выкладчык біялагічнага факультэта Вольга УГНАЧОВА.

— Гэты турнір не скіраваны на адну дысцыпліну, таму веды з любой галіны — каштоўнасць. Важным для ўсіх удзельнікаў падзеі з'яўляецца валоданне англійскай мовай. Па сваім вопыце (у 2016 годзе Соф'я таксама была часткай каманды ад Беларусі на «IYNT». — **Аўт.**) магу сказаць, што з кожным годам задачы становяцца больш складаныя, але нашы не адстаюць і заўсёды паказваюць высокія вынікі. Турнір ужо праводзіўся ў Турцыі, Балгарыі, Сербіі, Іране, Кітаі, Грузіі, сёлета выбар выпаў на Беларусь. Для нас гэта адказная місія, таму задумалі здзівіць прысутных незвычайнай візітоўкай. У нашай камандзе толькі дзяўчаты, і мы вырашылі гэта абыграць, паказаўшы гістарычную стужку, дзе расказалі пра вядомых беларускіх вынаходніц і гістарычных асоб. Нам хацелася данесці да гледача, што кожны з нас можа зрабіць нешта вартае для сваёй краіны, як і нашы папярэднікі, — расказала Соф'я.

Калі зазірнуць у аўдыторыі, дзе каманды сабраліся дзеля «навуковага бою», становіцца зразумела: форма дыскусіі нагадвае навуковы семінар або абарону дысертацыі. Кожная каманда тут выступае ў ролі дакладчыка, апанента і рэцэнзента. Пры гэтым любы яе ўдзельнік можа крытыкаваць, разважаць з супернікам па тэме, паказваць на ўдалыя і няўдалыя моманты адказу. Затым дакладчык абараняе свае вынікі, а члены журы выстаўляюць адзнакі ўсім удзельнікам. Пасля кароткага перапынку каманды мяняюцца ролямі.

— Гэтым разам мы высвятлялі, як соль уздзейнічае на ўрадлівасць глебы, — падзялілася адна з удзельніц беларускай каманды Лізавета АНДРОНЧЫК.

Мэта «IYNT» — распаўсюджванне творчага патэнцыялу падлеткаў, якія імкнуцца даследаваць свет, эксперыментаваць, працаваць у камандах і атрымліваць новыя веды. Турнірная форма інтэлектуальных спаборніцтваў была створана Яўгенам ЮНОСАВЫМ у 1979 годзе. Тады з'явіўся Турнір юных фізікаў (ТЮФ) — гэта «старэйшы брат» Міжнароднага Турніру юных даследчыкаў прыроды, які ўзнік у 2013 годзе. Пра ўнікальнасць «IYNT» і расказаў яго заснавальнік:

— Часцей за ўсё алімпіяды і турніры праводзяцца ў індывідуальным заліку. Пры стварэнні ж гэтага турніру хацелася, каб фармат быў камандны. Заданні, якія прапануюцца дзецям, паходзяць з розных сфер прыродазнаўчых навук і скіроўваюць да незалежных даследаванняў і эксперыментаў. Вельмі цяжка рашыць складаную задачу за кароткі прамежак часу, ды яшчэ і ў адзіночку. Таму ўдзельнікі ніяк не абмежаваныя ў спосабах іх вырашэння і могуць звяртацца па дапамогу да сяброў або бацькоў. Калі яны разглядаюць якія-небудзь навуковыя тэмы, рыхтуюць творчыя нумары, то лепш разумеюць свае інтарэсы, якія могуць дапамагчы вызначыцца з будучай кар'ерай. Акрамя таго, гэта добра развівае фантазію. Даследуючы навуку ў паўсядзённым жыцці, удзельнікі турніру даведваюцца, што некаторыя з самых дзівосных адкрыццяў знаходзяцца не больш чым за некалькі крокаў.

Падчас спаборніцтваў удзельнікі не толькі займаліся інтэлектуальнай працай, але і добра адпачывалі. Для ўсіх ахвотных былі праведзены экскурсіі па Мінску, Мірскім і Нясвіжскім замках, сядзібе Я. Наркевіча-Ёдкі. Акрамя таго, госці ацанілі гастранамічныя цікавінкі ад сталічных установаў. Па выніках міжнароднага турніру «IYNT» беларуская каманда заняла 10-е месца з 21, першае месца падзялілі Новая Зеландыя і Харватыя, другое — у Швейцарыі, на трэцім — каманды з Румыніі, Грузіі, Балгарыі, Грэцыі і Кітая. Мерапрыемства адбылося пры падтрымцы фонду «Навука вакол нас».

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

# ЗАЎСЁДЫ — ДОБРЫ НАСТРОЙ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Зманю, калі скажу, што вырашыла пайсці працаваць летам толькі дзеля вопыту. Заработная плата адыграла вялікую ролю. Я вельмі люблю падарожнічаць, а прасіць у 18 гадоў грошы ў бацькоў на свае жаданні неяк няёмка, і нават сорамна. З іншага боку, вопыт і знаёмствы, якія набыла ў санаторыі, сапраўды бясцэнныя. Я навучылася шукаць выйсце з цяжкіх сітуацый, знаходзіць кампрамісы ў розных спрэчках і, вядома ж, знаходзіць агульную мову з дзецьмі розных узростаў.

Працаваць у санаторыі аніматарам, на мой погляд, цяжэй, чым важатым у летніку. У апошнім у цябе ёсць змена і пэўны атрад, іншымі словамі, за ўвесь прамежак часу дзеці не будуць змяняцца: ты паспяваеш да іх прывыкнуць і ведаеш звычкі кожнага. Акрамя гэтага, усе яны прыкладна аднаго ўзросту. У нас жа ўсё было па-іншаму: дзеці абсалютна рознага ўзросту, самаму маленькаму, з якім мне давялося сутыкнуцца, было два гады, самым старэйшым — па 17. Да таго ж за месяц было праездаў пяць, кожны тыдзень з'яўляліся новыя адпачывальнікі, да якіх нанова трэба было шукаць свой падыход.

Гэта трэба рабіць не толькі ў дачыненні да дзяцей, але і да іх бацькоў. У кожнай сям'і свае правілы, парадкі, да якіх нам даводзілася крыху падладжвацца. Напрыклад, у некаторых сем'ях не дазвалялі сваім дзецям абліваца вадой, а, паколькі санаторый знаходзіцца каля возера, у гарачае надвор'е мы часта гулялі ў водныя гульні. Былі і такія бацькі, якія кантралявалі «кожны наш крок» і давалі парады, як і што лепш рабіць. У такія моманты галоўным было карэктна выйсці з сітуацыі.

Асноўным нашым абавязкам было забаўляць дзяцей. Кожны дзень мы малявалі афішы, прыдумлялі для іх нешта цікавае і яркае. Наш рабочы дзень пачынаўся ад 11-й раніцы з зарадкі і заканчваўся аб 11-й вечара дыскатэкай. Кожны дзень мы прыдумлялі новыя забавы: праводзілі спартландыі, розныя конкурсы, інтэлектуальныя гульні і творчыя майстар-класы.



Задача аніматараў не толькі весяліць, але яшчэ і займаць дзяцей фізічнай актыўнасцю.

Галоўнымі плюсамі ў гэтай падпрацоўцы для мяне былі прырода і дзеці. Першая на тэрыторыі санаторыя дзівосна прыгожая. Былі і лес, і возера. Калі прыехалі туды, у першы ж дзень адразу заўважылі розніцу ў паветры — у горадзе яно зусім іншае. Што датычыцца другіх, то было шмат дзяцей з розных краін: Англіі, Расіі, Францыі, Швецыі, Швейцарыі ды іншых. Часам адбываліся неспадзяванкі з-за таго, што яны гаварылі альбо з акцэнтам, альбо толькі на сваёй мове, у такія моманты прыходзілі на дапамогу бацькі ці перакладчык. Дзякуючы дзецям мы даведаліся пра асаблівасці жыцця ў розных краінах, пра новыя гульні, тэхналогіі і многае іншае.

У маёй напарніцы засталіся такія ўражанні:



Вечаровая рамантыка...

— За гэты месяц я атрымала вялікі вопыт не толькі ў рабоце з дзецьмі, але і ў знаходжанні кантакту з іх бацькамі. Было цікава працаваць з хлопчыкамі і дзяўчынкамі з розных краін. З падлеткамі мы лёгка знайшлі агульную мову і пасля рабочага дня з задавальненнем бавілі час разам з імі. Адзінае, што некалькі сапсавала ўражанне — гэта ўмовы пражывання без камфорту. Але ў асноўным я не шкадую, што паехала ў гэты санаторый і менавіта так правяла месяц лета, — падзялілася Настасся Кудраўцава.

Падводзячы вынікі: я зразумела, што работа з дзецьмі не такая простая, як здаецца на першы погляд. У рабоце аніматара, як і ў любой іншай, ёсць свае «падводныя камяні», якіх не відаць збоку. Аднак працаваць так далёка ад дому і з такой колькасцю дзяцей для мяне было цяжкавата.

**Ангеліна НОВІКАВА, студэнтка III курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.**

**ООО «СпецРеализация»** объявляет
**о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «Стройфинпроект» (УНП 690334841, г. Минск, ул. Беломорская, д. 21, пом. 142), находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства).**

***Дата и время проведения торгов***: **9 октября 2019 года**. Начало — 10.00. Заявки принимаются с 5 сентября 2019 года по 7 октября 2019 года.

